

# 100 ГОД

## ВІЦЕБСКАМУ АБЛАСНОМУ КРАЯЗНАЎЧАМУ МУЗЕЮ

УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

УСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

# 100 ГОД ВІЦЕБСКАМУ АБЛАСНОМУ КРАЯЗНАЎЧАМУ МУЗЕЮ

Матэрыялы навуковай канферэнцыі

Віцебск, 14 снежня 2018 г.

Мінск
Нацыянальная бібліятэка Беларусі
2024

УДК 069:908(476.5-25)(091)(06)
ББК 26.89(4Беи-2Вит)л611г.я431
С81

*Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета
Віцебскага абласнога краязнаўчага музея*

Рэдакцыйная калегія:
Т. А. Старынская, В. А. Шышанаў, А. Л. Ісачанка, В. М. Давідоўская

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт, галоўны спецыяліст
упраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Д. В. Юрчак

кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры
гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя П. М. Машэрава А. М. Дулаў

**100 год** Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы
С81 навук. канф., Віцебск, 14 снеж. 2018 г. / [рэдкал.: Т. А. Старынская і інш.]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2024. – 504 с.
ISBN 978-985-7293-44-5.

У зборнік уключаны даклады і паведамленні навуковай канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю стварэння Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, якая адбылася 14 снежня 2018 г.

Выданне прызначана гісторыкам, музейным работнікам, мастацтвазнаўцам, краязнаўцам, студэнтам.

**УДК 94(476.5)(06) + 908(476.5)(06)**
**ББК 63.3(4Беи-4Вит)я431**

**ISBN 978-985-7293-44-5**

© Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей», 2024
© Афармленне. Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі», 2024

## ПРАДМОВА

Віцебскі абласны краязнаўчы музей – адзін са старэйшых дзяржаўных музеяў у Беларусі. Пытанне аб стварэнні губернскага музея ўзнімалася віцебскімі ўладамі з верасня 1918 г., але галоўным штуршком стала перадача для гэтай справы збору выдатнага калекцыянера А.Р. Брадоўскага, што адбылася 12 лістапада 1918 г. З гэтай даты музей вядзе свой пачатак.

Але ў губернскага музея былі папярэднікі – музей Віцебскага губернскага статыстычнага камітэта (1868), Віцебскі царкоўна-археалагічны музей (1893), музей Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1909). Калекцыі ўзгаданых музеяў і губернскага музея былі аб'яднаны ў 1924 г. у Віцебскім аддзяленні Беларускага дзяржаўнага музея. З гэтага часу музей размясціўся ў будынку былой гарадской ратушы.

Напрыканцы XX ст. Віцебскі абласны краязнаўчы музей ператварыўся ў буйнае музейнае аб'яднанне, у якое ўваходзяць таксама мастацкі, музей гісторыі прыватнага калекцыянавання, музей-сядзіба І.Я. Рэпіна «Здраўнёва», асобная экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны» (былая турма СД).

У рамках святкавання 100-годдзя абласнога музея 14 снежня 2018 г. у Віцебску адбылася навуковая канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел гісторыкі, краязнаўцы, архівісты, супрацоўнікі музеяў, студэнты і аспіранты, якія прадстаўлялі амаль усе значныя навуковыя і музейныя ўстановы Беларусі.

У дакладах, якія прагучалі на канферэнцыі, былі ўзняты актуальныя пытанні сучаснага стану вывучэння і захавання гістарычнай спадчыны, сацыяльна-палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця краіны, археалогіі, этнаграфіі, мастацтвазнаўства, пытанні музейнай справы.

26. **Шовкопляс, А. М.** Некоторые гутные стеклянные изделия из Киева / А. М. Шовкопляс // Культура средневековой Руси / АН СССР, Ин-т археологии. – Ленинград, 1974. – С. 81–85.

27. **Ханко, О. В.** Гутне скло XVII–XVIII століть з Полтави / О. В. Ханко // Археологічний літопис Лівобережної України. – 2001. – № 2. – С. 125–127.

28. **Ciepiela-Kubalska, S.** Szklanice fletowate ze Starego Miasta w Warszawie (XIV/XV – 1 ćwierci XVII wieku) / S. Ciepiela-Kubalska // Acta Universitatis Nicolai Copernici. – Toruń, 1991. – Archeologia XIX. Archeologia szkła 5. – S. 25–42.

29. **Ciepiela, S.** Szkło osiemnastowieczne starej Warszawy / S. Ciepiela. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1977. – 144 s.

30. **Garas, M.** Wyroby Szklane / M. Garas, H. Karwowska // Założenie Rezydencjonalne Sapiehów w Dubnie. – Białystok : Museum Podlaskie w Białymstoku, 2013. – S. 257–286.

31. **Olczak, J.** Ręczny granat szklany z XVII wieku odkryty w Mogilnie / J. Olczak // Acta Universitatis Nicolai Copernici. Nauki Humanistyczno-Społeczne. – Toruń, 1989. – Zeszyt 191 : Archeologia XIV. Archeologia szkła 3. – S. 27–37.

32. **Simkute, I.** Glass Bottles from the 16th Century to the 19th Century in the Old Town of Klaipeda: Data from Archaeological Excavations / I. Simkute // Archaeologia Baltica. – Klaipeda, 2011. – Vol. 16 : Settlements and Towns. – P. 152–167.

***І.У. Магалінскі, А.Л. Коц*** *(Наваполацк)*

# ФРАГМЕНТЫ ХОРАСАЎ З ДАСЛЕДАВАННЯЎ НА ТЭРЫТОРЫІ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАГА ХРАМА СПАСА-ЕФРАСІННЕЎСКАГА МАНАСТЫРА Ў г. ПОЛАЦКУ Ў 2018 г.

Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў г. Полацку з’яўляецца адным з найбольш значных помнікаў старажытнарускага каменнага дойлідства на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Археалагічныя даследаванні царквы, якія з 2015 г. на рэгулярнай аснове праводзяцца экспедыцыяй Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, дазволілі ўдакладніць планіроўку, памеры, а таксама рэканструяваць першапачатковую архітэктуру храма, якая істотна адрознівалася ад яго цяперашняга выгляду.

Падчас археалагічных прац былі выяўлены шматлікія археалагічныя знаходкі, якія адносяцца да сферы старажытнага дойлідства (будаўнічыя матэрыялы, фрэскі, тынкоўка, цвікі і інш.), эканомікі і духоўнага жыцця.

У ходзе даследаванняў 2018 г., якія праходзілі ў паўднёвай частцы заходняга фасада і паўднёвага фасада заходняга прытвора царквы, атрымалася выявіць унікальную канструкцыю – падземны храм. Падчас разбору запаўнення збудавання былі знойдзены шматлікія фрагменты плінфы, аплаўкі свінца, фрагменты ліставога свінца для пакрыцця даху, цвікі і іншыя будаўнічыя матэрыялы. Сярод знаходак былі зафіксаваны таксама тры фрагменты старажытных асвятляльных прыстасаванняў – хорасаў, якія з'яўляюцца надзвычай рэдкай знаходкай і ў Полацку былі сустрэты толькі аднойчы (мал. 1).

Важным элементам матэрыяльнай культуры сярэдневяковых беларускіх гарадоў з'яўляліся прадметы хрысціянскага культу. Яны не толькі маркіравалі прыналежнасці да той ці іншай хрысціянскай канфесіі, але і з'яўляліся выдатнымі ўзорамі ювелірнага рамяства. Сярод дадзенай катэгорыі знаходак найбольш частымі з'яўляюцца прадметы хрысціянскага культу асабістага выкарыстання (крыжы-цельнікі, абразкі, крыжы-энкалпіёны). Да ліку больш рэдкіх знаходак адносяцца богаслужэбныя прадметы, сярод якіх можна вылучыць старажытныя царкоўныя асвятляльныя прыстасаванні – хорасы.

Уяўленне адносна канструкцыйных адметнасцей хорасаў даюць нешматлікія знаходкі фрагментаў і цэлых экзэмпляраў падобных вырабаў, якія сустрэты падчас раскопак гарадоў на ўсёй старажытнарускай тэрыторыі. Аснову хорасаў складае ажурнае колца, ці дыск, з асобна адлітых і змацаваных паміж сабой пласцін з усталяванымі на іх вострымі кранштэйнамі для свечак і валютападобнымі адгалінаваннямі, часта з фігуркамі птушак і драконаў [1, с. 167].

У цэнтры дыска звычайна размяшчалася паўсфера з трапецападобнымі ажурнымі пласцінамі, якія запаўнялі дно. Ажурныя ланцугі прымацоўвалі дыск да кандзеі, у якой знаходзілася колца для падвешвання хораса да столі. Звычайна асноўным арнаментальным матывам гэтых прадметаў з'яўлялася крыжападобная пляцёнка з асобнымі адросткамі і крыжападобнымі кветкамі ці кругі з кры-

жападобным запаўненнем. Семантычна арнамент на хорасах звязваюць з сімваламі сонца і агню [2, с. 276].

Багатаарнаментаваныя хорасы, якія цалкам захаваліся, датуюцца пераважна XI ст. Экзэмпляры хорасаў XII–XIII стст. адрозніваюцца больш сціплай арнаментацыяй, аднак маюць аналагічную з папярэднім перыядам канструкцыю [1, с. 167; 3, табл. 1: VIII ].

Існуе меркаванне, што часцей за ўсё хорасы з'яўляліся абавязковым атрыбутам мураваных храмаў. Знаходкі фрагментаў падобных прылад зафіксаваны не толькі ў межах буйных гарадскіх і культурных цэнтраў, але і ў меншых па памерах населеных пунктах [1, с. 167]. Верагодна, хорасы маглі выкарыстоўвацца не толькі для асвятлення храмаў, але і прыватных дамоў заможных гараджан. Пра гэта сведчыць знаходка фрагмента кранштэйна для свечак у доме ювеліра XII ст. з Наваградка [4, с. 93, мал. 76: 8].

Лічыцца, што больш позні хорасы паслужылі прататыпамі для панікадзіл з абавязковым вастрыём у цэнтры. Познія асвят-




Малюнак 1

ляльныя прыборы пераходнага тыпу захоўвалі яшчэ ажурнае колца з кранштэйнамі для свечак, аднак ужо мелі і цэнтральнае верацяно, на якім мацаваліся яго дэталі, як у панікадзіла [5, с. 259].

Полацкія знаходкі прадстаўлены трыма фрагментамі хорасаў. Першы фрагмент мае памеры 14,6×1,6×6,5 см (мал. 1:3). Выраб масіўны, фрагментаваны (абламана вастрыё кранштэйна), фігурны, стрыжнёвы, выгнуты ў выглядзе крыжападобнай кветкі. Прадмет зроблены са сплаву на аснове медзі, адліты ў двухбаковай ліцейнай форме (пра гэта сведчаць ліцейныя швы, апрацаваныя пасля адліўкі напільнікам).

Другая знаходка прадстаўлена фрагментам выгнутага ў выглядзе крыжападобнай кветкі прадмета з двухбаковым лінейным арнаментам па ўсёй плошчы. Памеры вырабу – 9,5×7,8×1,2 см (мал. 1:1). Дэталь зроблена са сплаву на аснове медзі, літая ў двухбаковай ліцейнай форме, аздоблена чаканным лінейным арнаментам. Пра выраб прадмета ў двухбаковай форме сведчаць ліцейныя швы, якія захаваліся ўздоўж вырабу.

Яшчэ адна знаходка прадстаўлена фрагментам (ніжняй часткай) кранштэйна для свечак са страчаным вастрыём (мал. 1:2). Выраб дэкаратыўны, фігурны, літы са сплаву на аснове медзі. Памеры прадмета – 4,6×3,6×1,4 см.

Полацкія знаходкі можна суаднесці з фрагментамі трох розных хорасаў. Верагодна, што прыстасаванні не выкарыстоўваліся для асвятлення падземнага храма, дзе яны былі знойдзены, а паходзяць ці з самой Спаса-Праабражэнскай царквы, ці з храма-пахавальні полацкіх епіскапаў, на што ўказваюць і іншыя знаходкі з запаўнення падземнай канструкцыі.

На тэрыторыі Беларусі знаходкі фрагментаў хорасаў вядомы ў Ваўкавыску, Наваградку і Віцебску [4, с. 93; 6, с. 49]. Фрагмент ажурнага ланцуга хораса паходзіць таксама з матэрыялаў археалагічных даследаванняў на тэрыторыі гарадзішча Полацка (раскопкі Д.У. Дука 2007 г.) [7, с. 187].

Аналогіі полацкім артэфактам вядомы па знаходках у Кіеве, Княжай Гары, Васілеве і іншых, дзе былі знойдзены старажытныя мураваныя храмы, пераважна XII–XIII стст. [1, с. 167; 3, табл. 1: VIII; 9, мал. 146].

Такім чынам, археалагічныя даследаванні 2018 г. на тэрыторыі Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра не толькі дазволілі выявіць новы ўнікальны помнік старажытнага каменнага дойлідства – падземны храм, але і прынеслі цікавыя знаходкі. Сярод археалагічных артэфактаў асобна стаяць знаходкі трох фрагментаў старажытных асвятляльных прыбораў – хорасаў, якія да цяперашняга часу толькі аднойчы былі сустрэты ў матэрыялах археалагічных даследаванняў старажытнага Полацка. Знаходкі, верагодна, паходзяць ці са Спаса-Праабражэнскай царквы, ці з храма-пахавальні полацкіх епіскапаў.

## ЛІТАРАТУРА І КРЫНІЦЫ

1. **Николаева, Т. В.** Предметы христианского культа / Т. В. Николаева, Н. Г. Недошивина // Древняя Русь. Быт и культура / под общ. ред. Б. А. Рыбакова. – Москва, 1997. – С. 166–179.

2. **Рыбаков, Б. А.** Прикладное искусство Киевской Руси IX–XI веков и южнорусских княжеств XII–XIII веков / Б. А. Рыбаков // История русского искусства : в 13 т. – Москва : Изд-во АН СССР, 1953. – Т. 1. – 576 с.

3. **Каргер, М. К.** Древний Киев / М. К. Каргер. – Москва ; Ленинград : АН СССР, 1958. – Т. 1. – 579 с.

4. **Гуревич, Ф. Д.** Древний Новогрудок (посад – окольный город) / Ф. Д. Гуревич. – Ленинград : Наука, 1981. – 160 с.

5. **Рыбаков, Б. А.** Ремесло древней Руси / Б. А. Рыбаков. – Москва : АН СССР, 1948. – 784 с.

6. **Зверуго, Я. Г.** Древний Волковыск (X–XIV вв.) / Я. Г. Зверуго. – Минск : Наука и техника, 1975. – 144 с.

7. **Колединский, Л. В.** О витебском храме св. Михаила / Л. В. Колединский // Актуальные проблемы архитектуры Белорусского Подвинья и сопредельных регионов : сб. статей респ. науч.-практ. семинара, Новополоцк, 8–9 окт. 2015 г. / под общ. ред. В. Е. Овсейчика (отв. ред.), Г. И. Захаркиной, Р. М. Платоновой. – Новополоцк : ПГУ, 2015. – С. 62–72.

8. **Дук, Д. У.** Археалагічныя раскопкі на старажытным полацкім гарадзішчы ў 2007 г. / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Археалагічныя даследаванні на Беларусі ў 2007 годзе. – Мінск : Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2009. – Вып. 17. – С. 186–189.

9. **Логвин, Г. Н.** Белокаменный храм XII века в Василеве / Г. Н. Логвин, Б. А. Тимощук // Памятники культуры : исследования и реставрация / Акад. наук СССР ; Науч.-методический совет по охране памятников культуры. – Москва : АН СССР. – 1961. – Вып. 3. – С. 37–50.